Carlsberg Group

# КОДЭКС ЭТЫКІ І ПАВОДЗІН


Carlsberg

# УВОДЗІНЫ

Асноўнымі каштоўнасцямі Carlsberg Group з'яўляюцца добрасумленнасць і адказнасць, а таксама сумленнае і этычнае вядзенне бізнесу. Дадзены Кодэкс этыкі і паводзін («Кодэкс») падтрымлівае нашу стратэгію і дапамагае абараніць рэпутацыю Carlsberg Group як адказнай глабальнай піваварнай кампаніі.

# МЭТА

Мэта гэтага Кодэкса – забяспечыць добрае разуменне супрацоўнікамі і дзелавымі партнёрамі Carlsberg Group тых прынцыпаў і этычных каштоўнасцей, якіх мы прытрымліваемся. Гэтым Кодэксам мы пацвярджаем нашу прыхільнасць да пэўных стандартаў паводзін, падтрымліваем іх, а таксама садзейнічаем сумленным і этычным паводзінам.

Гэты Кодэкс не можа ахапіць усе ўзнікаючыя пытанні, таму неабходна, каб, дзейнічаючы ад імя Групы, супрацоўнікі і дзелавыя партнёры кіраваліся разважлівасцю і разумным сэнсам. У выпадку калі супрацоўнік або дзелавы партнёр не адчувае сябе ўпэўненым у прымяненні пэўнага палажэння гэтага Кодэкса, яму трэба звярнуцца за растлумачэннямі да супрацоўніка, адказнага за пытанні камплаенсу, або юрыста.

# ГАЛІНА ПРЫМЯНЕННЯ І МЭТАВАЯ АЎДЫТОРЫЯ

Дадзены Кодэкс прымяняецца глабальна, яго дзеянне распаўсюджваецца на кіраўніцтва, работнікаў і асоб, працуючых на падставе дагавораў грамадзянска-прававога характару, усіх юрыдычных асоб, якія непасрэдна або ўскосна кантралююцца кампаніяй Carlsberg A/S. Палажэнні Кодэкса таксама павінны быць даведзены да ведама юрыдычных асоб, у якіх Carlsberg Group не валодае кантрольным пакетам акцый.



## 01. **ВЫКАНАННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА І КАРПАРАТЫЎНЫХ ПАЛІТЫК**

Рэпутацыя і бізнес Carlsberg Group залежаць ад ведання і выканання дзеючых законаў, правіл і нарматыўных дакументаў. Як супрацоўнік Вы абавязаны выконваць іх. Акрамя таго, Вы павінны быць паінфармаваны аб палітыках і працэдурах Групы, разумець і строга прытрымлівацца іх, наведваць трэнінгі, а ў выпадку няўпэўненасці адносна якіх-небудзь палажэнняў заканадаўства або карпаратыўных палітык — задаваць пытанні.



## 02. **ВЫКАНАННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА І КАРПАРАТЫЎНЫХ ПАЛІТЫК**

Карупцыя і подкуп забаронены амаль ва ўсіх краінах, дзе Carlsberg Group вядзе бізнес. Перадача, абяцанне перадачы грашовых сродкаў, прадастаўленне матэрыяльнай або іншай выгады дзяржаўным служачым у мэтах атрымання або захавання магчымасцей па вядзенні бізнесу або незаконнай перавагі перад канкурэнтамі, як правіла, процізаконныя. Парушэнне часта з'яўляецца злачынствам, якое вядзе да накладання буйных штрафаў або пазбаўлення волі. Адказнасць настае незалежна ад таго, учынена такое дзеянне непасрэдна супрацоўнікамі або праз трэціх асоб, такіх як агенты, кансультанты або пасрэднікі.

Carlsberg Group разглядае любую форму подкупу як несумленнае, маральна ганебнае і непрымальнае дзеянне. Такім чынам, фасілітацыйныя плацяжы ў цэлым забаронены незалежна ад таго, устаноўлена на іх забарона мясцовым заканадаўствам ці не. Таксама забаронена праводзіць плацяжы па здзелках, не маючых рэальнага прадмета выканання (без намеру на самай справе атрымаць аплатныя тавары, работы або паслугі) і належнага афармлення. Калі Вы маеце намер зрабіць падарунак або аказаць знак дзелавой гасціннасці дзяржаўнаму служачаму, то, незалежна ад краіны, гэта павінна быць ажыццёўлена ў строгай адпаведнасці з прымяняльным антыкарупцыйным заканадаўствам, а таксама з захаваннем працэдур і лімітаў, устаноўленых у Carlsberg Group. Акрамя таго, Вам неабходна папярэдне атрымаць адабрэнне ад супрацоўніка, адказнага за пытанні камплаенсу Вашай кампаніі.



## 03. ГАНДЛЁВЫЯ САНКЦЫІ І ЗАКОНЫ АБ ЭКСПАРТНЫМ КАНТРОЛІ

ЕС, ААН, ЗША і многія іншыя краіны ўвялі гандлёвыя санкцыі, якія забараняюць гандаль з пэўнымі асобамі і арганізацыямі з некаторых рэгіёнаў. Гэтыя санкцыі таксама забараняюць экспарт у асобныя краіны пэўных тыпаў (піваварнага) абсталявання. Парушэнне гандлёвых санкцый можа мець істотныя наступствы, у тым ліку штрафы ў дачыненні да Carlsberg Group, штрафы або пакаранне, звязанае з пазбаўленнем волі, у дачыненні да кіраўнікоў і супрацоўнікаў Групы, менш прывабныя ўмовы па крэдытных лініях для Групы і істотны рэпутацыйны ўрон. Для забеспячэння выканання гандлёвых санкцый і законаў аб экспартным кантролі адпаведная праверка павінна быць праведзена на ўзроўні Групы на самай ранняй стадыі, каб пазбегнуць уступлення ў перагаворы з асобамі і арганізацыямі, якія падпадаюць пад санкцыйныя абмежаванні. Калі ў Вас ёсць сумненні адносна актуальнасці гандлёвых санкцый або экспартнага кантролю, пракансультуйцеся з юрыстам Вашай кампаніі або юрыстам Групы.



## 04. ЗАКАНАДАЎСТВА АБ КАНКУРЭНЦЫІ

Заканадаўства аб абароне канкурэнцыі, таксама вядомае як антытрэстаўскае або антыманапольнае заканадаўства, забараняе паводзіны, якія наносяць шкоду канкурэнцыі і спажыўцам. Прыкладамі такіх паводзін з'яўляюцца антыканкурэнтныя пагадненні, такія як устанаўленне цаны перапродажу, падзел рынку па тэрытарыяльным прынцыпе або складзе пакупнікоў, каардынацыя цэнавых прапанаванняў паміж кампаніямі – удзельнікамі таргоў, злоўжыванне дамінуючым становішчам на рынку, непаведамленне аб здзелках, патрабуючых абавязковага раскрыцця антыманапольным органам. Парушэнне вядзе да строгага пакарання як для юрыдычных (самой кампаніі, яе кліентаў – аптовых пакупнікоў), так і фізічных асоб, у тым ліку штрафаў (да 10% ад гадавой глабальнай выручкі Carlsberg Group), пазбаўлення волі і наносіць урон рэпутацыі. Такім чынам, важна, каб Вы ў сваёй дзейнасці прытрымліваліся адпаведных законаў і іншых нарматыўных дакументаў аб абароне канкурэнцыі. У выпадку сумненняў адносна парушэння заканадаўства аб абароне канкурэнцыі Вам неабходна звязацца з юрыстам Вашай кампаніі або юрыстам Групы.


ПИВО СВАРЕНО ДЛЯ ВАС
БАЛТИКА
3
Классическое
4,8% ОБ.
БАЛТИКА



## 05. **ЗАКАНАДАЎСТВА АБ АБАРОНЕ ДАНЫХ І ПРЫВАТНАГА ЖЫЦЦЯ**

Збор, выкарыстанне, захоўванне і трансгранічная перадача персанальных даных фізічных асоб усё часцей становіцца прадметам рэгулявання. Carlsberg Group з павагай ставіцца да канфідэнцыяльнасці даных сваіх супрацоўнікаў, падрадчыкаў, кліентаў, пастаўшчыкоў, спажыўцоў, а таксама іншых трэціх асоб, з якімі яна вядзе бізнес. Група прымае належныя і дастатковыя меры засцярогі для абароны ад публічнага раскрыцця інфармацыі асабістага характару.



## 06. **АДКАЗНАЕ СПАЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ**

Carlsberg Group мае выразнае ўяўленне аб карысці піва і аб нашай ролі ў зніжэнні негатыўнага ўплыву ад яго злоўжывання як на некаторых асоб, так і грамадства ў цэлым. Вы, як амбасадар брэндаў Carlsberg Group, павінны заўсёды папулярызаваць асалоду ад піва ва ўмеранай колькасці. У прыватнасці, чакаецца, што супрацоўнікі, якія займаюць кіруючыя пасады, павінны выступаць ролевай мадэллю і прапагандаваць адказнае ўжыванне алкаголю.
Адносна ўжывання алкаголю намі прыняты строгія стандарты. Забараняецца з'яўляцца на рабоце ў стане алкагольнага ап'янення; кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення таксама з'яўляецца непрымальным і можа прывесці да звальнення. Ужыванне алкаголю ў рабочы час з'яўляецца непрымальным за выключэннем выпадкаў, калі на гэта ёсць спецыяльны дазвол у час мерапрыемстваў, якія спансіруюцца Carlsberg Group, або ў рэдкіх выпадках, калі гэта ўваходзіць у службовыя абавязкі супрацоўніка. Ва ўсіх такіх выпадках неабходна ўзгадненне з вышэйстаячым кіраўніком.



## 07. **КАНФЛІКТ ІНТАРЭСАЎ**

Канфлікт інтарэсаў адбываецца тады, калі Вашы асабістыя інтарэсы або асабістыя інтарэсы трэціх асоб, такіх як пастаўшчыкі, сваякі або кліенты, могуць паўплываць на Вашу здольнасць дзейнічаць аб'ектыўна і ў лепшых інтарэсах Carlsberg Group. Іншым часам канфлікт інтарэсаў можа адбыцца без якіх-небудзь дзеянняў з Вашага боку. Адпаведна, Вы не павінны прымаць удзел у дзейнасці, якая ўяўляе сабой або можа быць успрынята так, быццам мае для Вас асабісты інтарэс.

Раскрыццё выпадкаў канфлікту інтарэсаў гэтак жа важна, як і іх выяўленне і прадухіленне. Вы павінны паведамляць свайму кіраўніку, аддзелу па рабоце з персаналам або супрацоўніку, адказнаму за пытанні камплаенсу Вашай кампаніі, аб здзелках або адносінах, якія могуць прывесці да ўзнікнення канфлікту інтарэсаў.



## 08. **ІНСАЙДАРСКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І АПЕРАЦЫІ З КАШТОЎНЫМІ ПАПЕРАМІ**

Інсайдарская інфармацыя — гэта прызначаная выключна для ўнутранага карыстання інфармацыя аб публічнай кампаніі, гэта значыць кампаніі, акцыі якой удзельнічаюць у таргах на біржы (напрыклад, Carlsberg A/S), або яе акцыях і аблігацыях, раскрыццё якой можа паўплываць на цану акцый кампаніі. Напрыклад, да інсайдарскай інфармацыі могуць быць аднесены звесткі аб фінансавых рэзультатах кампаніі, здзелках па зліцці і паглынанні, аб адчужэнні актываў, аб выхадзе на новыя рынкі, запуску новых прадуктаў, пачатку або спыненні сумеснай дзейнасці з трэцімі асобамі.

Калі Вы валодаеце інсайдарскай інфармацыяй аб Carlsberg A/S або якой-небудзь іншай публічнай кампаніі Carlsberg Group, Вы не можаце купляць або прадаваць ці рэкамендаваць трэцім асобам куплю або продаж акцый гэтай кампаніі; Вам таксама нельга раскрываць інсайдарскую інфармацыю, акрамя выпадкаў, калі гэта строга неабходна для выканання Вашых службовых абавязкаў.

Заканадаўчае рэгуляванне інсайдарскай інфармацы і аперацый з каштоўнымі паперамі мае складаны характар, і яго парушэнне можа прывесці да ўчынення крымінальнага злачынства. Калі Вы не ўпэўнены, ці дазваляецца Вам праводзіць здзелкі з акцыямі Carlsberg A/S або акцыямі любой іншай публічнай кампані, або ў вас ёсць пытанні адносна заканадаўства аб інсайдарскай інфармацыі, трэба пракансультавацца з карпаратыўным сакратаром кампаніі Carlsberg або юрыстам Вашай кампаніі.



## 09. **ЗАХАВАННЕ І НАЛЕЖНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ МАЁМАСЦІ І РЭСУРСАЎ КАМПАНІІ**

Дзейнасць Carlsberg Group залежыць ад захавання і належнага выкарыстання прыналежных ёй маёмасці і рэсурсаў. Крадзеж, нядбайнасць і марнатраўства ўплываюць непасрэдна на фінансавыя паказчыкі Групы.
Вы павінны прытрымлівацца працэдур і практык, распрацаваных для захавання вартасці маёмасці Групы, да якой адносяцца матэрыяльныя і нематэрыяльныя активы, такія як інтэлектуальная ўласнасць, уключаючы каштоўныя таварныя знакі Групы, ноу-хау і канфідэнцыяльную інфармацыю. Вы можаце выкарыстоўваць маёмасць і рэсурсы Групы толькі ў законных дзелавых мэтах, але не для сваёй асабістай выгады.



# 10. КАНФІДЭНЦЫЯЛЬНАЯ І СЛУЖБОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Канфідэнцыяльная і службовая інфармацыя ўключае ў сябе інфармацыю для ўнутранага карыстання. У выпадку раскрыцця гэта інфармацыя, у тым ліку канфідэнцыяльная інфармацыя трэціх асоб, перададзеная Carlsberg Group, можа быць выкарыстана канкурэнтамі або здольна прычыніць шкоду Групе.

Вы заўсёды павінны захоўваць камерцыйную тайну адносна канфідэнцыяльнай або службовай інфармацыі, даверанай Вам кампаніямі, што ўваходзяць у Carlsberg Group, або іншымі кампаніямі, у тым ліку пастаўшчыкамі і кліентамі Групы. Несанкцыянаванае раскрыццё любой канфідэнцыяльнай або службовай інфармацыі забаронена. Такое раскрыццё можа нанесці шкоду канкурэнтаздольнасці як Групы, так і яе пастаўшчыкоў або кліентаў і прывесці да прыцягнення Вас або Групы да юрыдычнай адказнасці. Вы павінны прымаць неабходныя меры засцярогі для аховы канфідэнцыяльнай інфармацыі і забяспечыць яе нераскрыццё ўнутры Групы акрамя супрацоўнікаў, якім яна неабходна для выканання сваіх службовых абавязкаў. Супрацоўнікі і контрагенты павінны паважаць гэтыя палажэнні аб канфідэнцыяльнасці і выконваць іх нават пасля спынення сваёй работы з Групай.

У выпадку з'яўлення якіх-небудзь пытанняў або сумненняў адносна дапушчальнасці раскрыцця канфідэнцыяльнай або службовай інфармацыі трэба неадкладна звяртацца да віцэ-прэзідэнта па прававых пытаннях Carlsberg Group. Адказваць на пытанні, што паступаюць ад сродкаў масавай інфармацыі, могуць толькі ўпаўнаважаныя прадстаўнікі кампаніі.



## 11. **УМОВЫ РАБОТЫ**

Carlsberg Group імкнецца быць сумленным работадаўцам. Негатыўныя паводзіны з боку супрацоўніка або групы супрацоўнікаў, запужванне і любая іншая форма націску недапушчальны. У Групе працуюць больш за 40 000 супрацоўнікаў, і для кампаніі характэрна значная культурная разнастайнасць. Мы ганарымся сваім глабальным кадравым складам. Прыём на работу, развіццё і кар'ерны рост супрацоўнікаў адбываецца незалежна ад іх расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых поглядаў, касты, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмасці, месца нараджэння, прыналежнасці да прафсаюза, сексуальнай арыентацыі, стану здароўя, узросту, інваліднасці і іншых адрозненняў.



## 12. **ПАДАРУНКІ, ПАЧАСТУНКІ І ЗАБАВЫ**

У час звычайнай гаспадарчай дзейнасці для падтрымання і развіцця дзелавых адносін супрацоўнікам дазваляецца дарыць і атрымліваць падарункі, прадастаўляць і прымаць пачастункі і забавы.

Вы можаце дарыць толькі такія падарункі, якія нязначныя па вартасці і не прадугледжваюць якога-небудзь дзеяння ў адказ з боку атрымальніка падарунка. Падарункі ў выглядзе наяўных грашовых сродкаў забаронены.

Вы не павінны прымаць або дазваляць членам Вашай сям'і прымаць падарункі або паслугі ад кліента, пастаўшчыка або іншай асобы, якая вядзе або мае намер весці справы з Carlsberg Group. Выключэнне складаюць толькі прадметы нязначнай каштоўнасці, што ўручаюцца з законнай дзелавой мэтай. Падарункі, каштоўнасць якіх не з'яўляецца нязначнай, падлягаюць неадкладнаму вяртанню дарыльшчыку з інфармаваннем аб гэтым Вашага кіраўніка. Калі неадкладнае вяртанне падарунка немагчыма з практычнага пункту гледжання, такі падарунак павінен быць перададзены супрацоўніку, адказнаму за пытанні камплаенсу Вашай кампаніі, для далейшага распараджэння ім у дабрачынных мэтах або іншым чынам, які Група паліча мэтазгодным.

Любую забаву, што прадастаўляецца асобе або прымаецца ад асобы, з якой Carlsberg Group мае дзелавыя адносіны, варта абмежаваць знакамі гасціннасці, якія павінны мець нячасты характар, быць дарэчы, накіраванымі на законныя дзелавыя мэты, і ні пры якіх абставінах не павінны падразумяваць дзеянні ў адказ або аказваць уплыў на Вашу здольнасць прымаць аб'ектыўныя і законныя рашэнні.





## 13. ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І АХВЯРАВАННІ

Як і для большасці іншых кампаній, наша дзейнасць патрабуе ўсталявання ўзаемаадносін з органамі дзяржаўнай улады. Аднак калі Вы як прыватная асоба прымаеце ўдзел у палітычнай дзейнасці, то заявы або ўнясенне фінансавых узносаў у палітычныя арганізацыі павінны ажыццяўляцца ад Вашага імя, а не ад імя Carlsberg Group. Ахвяраванні на дабрачыннасць вітаюцца, але яны павінны праводзіцца празрыстым і прафесійным спосабам.



## 14. ДАКЛАДНАСЦЬ БУХГАЛТАРСКІХ КНІГ, УЛІКОВЫХ ДАНЫХ І ПУБЛІЧНЫХ СПРАВАЗДАЧ

Дакладнасць бухгалтарскіх кніг, уліковых даных і дакументаў, што падаюцца Carlsberg Group у дзяржаўныя органы, неабходна для выканання кампаніяй патрабаванняў заканадаўства і рэгулюючых органаў. У дадатак да лакальных патрабаванняў справаздачныя дакументы Carlsberg A/S як публічнай кампаніяй павінны адпавядаць патрабаванням фондавай біржы. На аснове ўліковых даных Групы фарміруюцца розныя справаздачы і заявы для грамадскасці, інвестараў і дзяржаўных органаў, прымаюцца аперацыйныя рашэнні і вядзецца стратэгічнае планаванне дзейнасці Групы. Такім чынам, важна, каб нашы бухгалтарскія кнігі, уліковыя даныя, публічныя справаздачы былі поўнымі, дакладнымі і выпускаліся ва ўстаноўлены тэрмін. Вам належыць сумленна паведамляць пра ўсе гаспадарчыя аперацыі і весці дакладныя запісы. Недапушчальна наўмысна прадастаўляць у бухгалтэрыю несапраўдныя або недакладныя звесткі ў сувязі з аўдытам, праверкай або рэвізіяй фінансавай справаздачнасці Групы або падрыхтоўкай і падачай дакументаў, справаздач для рэгулюючых органаў.

# ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПАРУШЭННЯХ ГЭТАГА КОДЭКСА І АБАРОНА АД ПРАСЛЕДАВАННЯ

Чакаецца, што Вы адказна падыходзіце да выканання гэтага Кодэкса - задаяце пытанні, звяртаецеся за парадамі, як паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі, паведамляеце аб парушэннях і праяўляеце непакой адносна выканання палажэнняў гэтага Кодэкса. Калі Вам вядома або Вы падазраваеце, што нехта з супрацоўнікаў або прадстаўнікоў Carlsberg Group дзейнічаў або дзейнічае ў парушэнне заканадаўства або дадзенага Кодэкса, аб гэтым трэба паведаміць Вашаму кіраўніку або супрацоўніку, адказнаму за пытанні камплаенсу. Кіраўнік, якому паведамілі аб парушэнні гэтага Кодэкса, павінен неадкладна інфармаваць аб гэтым супрацоўніка, адказнага за пытанні камплаенсу, а не пачынаць самастойнае расследаванне.
Вы можаце ананімна паведамляць аб парушэннях шляхам звароту да супрацоўніка, адказнага за пытанні камплаенсу, або праз сістэму інфармавання Carlsberg Group аб парушэннях (Сістэма адкрытага выказвання). Carlsberg Group забараняе праследаваць супрацоўнікаў, якія сумленна паведамляюць аб парушэннях або аказваюць садзейнічанне ў расследаваннях, звязанных з неналежнымі паводзінамі. Кіраўнікі не маюць права звальняць, паніжаць у пасадзе, адхіляць ад работы, пагражаць, аказваць націск або іншым чынам дыскрымінаваць супрацоўніка, які добрасумленна паведамляе аб магчымым парушэнні.

# НЕВЫКАНАННЕ ГЭТАГА КОДЭКСА

Невыкананне гэтага Кодэкса вядзе да прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці вінаватых, у тым ліку з прымяненнем у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам мер спагнання ў выглядзе папярэджання, вымовы, адхілення ад работы, паніжэння ў пасадзе, зніжэння памеру заработнай платы і звальнення. Пэўныя парушэнні гэтага Кодэкса могуць патрабаваць ад Carlsberg Group інфармавання праваахоўных органаў для правядзення расследавання або прыцягнення да адказнасці. Кіраўнікі, якія пабуджаюць, адабраюць або ігнаруюць паводзіны, што парушаюць гэты Кодэкс, або даведаліся, але неадкладна не паведамілі аб такіх паводзінах, таксама могуць быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці аж да звальнення. Кіраўніцтва не нясе адказнасці за страты, панесеныя Кампаніяй у выніку няўхільнага выканання гэтага Кодэса.

# РАСПАЎСЮДЖВАННЕ І ЗМЯНЕННЕ

З тэкстам гэтага Кодэкса павінны быць азнаёмлены ўсе новыя супрацоўнікі, асобы, якія працуюць на падставе дагавораў грамадзянска-прававога характару, і дырэктары ўсіх арганізацый, непасрэдна або ўскосна кантралюемых кампаніяй Carlsberg A/S, пасля пачатку працоўных або іншых адносін з кампаніяй. Вышэйпералічаныя асобы павінны пісьмова пацвердзіць атрыманне, прачытанне, разуменне Кодэкса і згоду выконваць яго палажэнні.

Carlsberg Group пакідае за сабой права ў любы час і незалежна ад прычыны ўносіць змяненні ў гэты Кодэкс або поўнасцю адмяняць яго. Дзеючая версія гэтага Кодэкса даступна на ўнутраным партале Carlsberg Group.

# РЭДАКЦЫІ

Дадзены Кодэкс падлягае перагляду як мінімум раз у тры гады, унясенне змяненняў у гэты Кодэкс магчыма ў любы час пры ўмове атрымання адабрэння Выканаўчага камітэта. У выпадку разыходжанняў паміж версіяй гэтага дакумента на англійскай мове і перакладзенай версіяй, перавагу мае версія на англійскай мове.

BELARUSIAN

November 2016 edition

Carlsberg Breweries A/S
100 Ny Carlsberg Vej
1799 Copenhagen V
Denmark

Phone: +45 3327 3300
www.carlsberggroup.com

Group Compliance
Compass@carlsberg.com